Источник: "Народная газета" - 2018-04-20

# КАЗКА ПЕРАД СНОМ



**Восем мінскіх бібліятэк запрашаюць сёння на "Бібліяноч".**

Калі вы на манер героя Віцына з фільма "Аперацыя "Ы" і іншыя прыгоды Шурыка" запытаецеся гэтай ноччу, як прайсці ў бібліятэку, наўрад ці хтосьці пакруціць пальцам ля скроні. Бо сёння дазваляецца прыйсці за кнігай аж да 23.00! У штогадовай акцыі ў падтрымку чытання сёлета прымаюць удзел восем бібліятэк, сярод іх тры — дзіцячыя. Таму не спяшайцеся ні самі класціся спаць, ні дзяцей адпраўляць у ложак.

Кожная бібліятэка падрыхтавала для чытачоў арыгінальную праграму на пэўную тэму. Да прыкладу, Нацыянальная бібліятэка запрашае здзейсніць падарожжа паміж эпохамі і пакаленнямі. У прыватнасці, для тых, хто настальгіруе па савецкім мінулым, тут падрыхтавалі выставу "Зроблена ў СССР", піянерскую пляцоўку і куток савецкай моды. Тых, хто прыйдзе ў Цэнтральную навуковую бібліятэку НАН, чакаюць навукова-папулярныя лекцыі, цікавыя воркшопы, захапляльны кулінарны батл і віртуальнае падарожжа па старажытных гарадах і замках. А чытачы Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы патрапяць у створаны на адну ноч Гарадскі квартал. У Доме рамёстваў для іх будуць арганізаваны сустрэча з экспертам беларускай кухні Аленай Мікульчык і майстар-клас па наданні старым рэчам другога жыцця, у Доме творчасці — інтэрактыўная праграма ад папулярных пісьменнікаў, у Доме дружбы — канцэртная пляцоўка з удзелам кітайскіх студэнтаў. Багата атракцый падрыхтавала кожная з устаноў для маленькіх чытачоў, таму наведаць "Бібліяноч" можна і пажадана цэлымі сем'ямі.

Людміла Мінкевіч. Казка перад сном